вартай, высветлілі, што ў Рэспубліцы Беларусь, у адрозненне ад заканадаўства разгледжаных дзяржаў, дадзеная катэгорыя асоб адносіцца да суб'ектаў, актыўнае выбарчае права якіх абмежавана. Аднак адносна права быць выбраным устанавілі, што асобы, якія змяшчаюцца пад вартай, валодаюць магчымасцю рэалізаваць пасіўнае выбарчае права.

З улікам вышэй пададзенага лічым неабходным з артыкула 64 Канстытуцыі, а таксама з артыкула 4 Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь выключыць наступнае палажэнне: «У галасаванні не прымаюць удзелу асобы, у адносінах да якіх у парадку, устаноўленым крымінальна-працэсуальным заканадаўствам, выбрана мера стрымання – утрыманне пад вартай». Зыходзячы з гэтага прапануем частку 2 артыкула 64 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь выкласці ў наступнай рэдакцыі: «У выбарах не ўдзельнічаюць грамадзяне, прызнаныя судом недзеяздольнымі, асобы, якія ўтрымліваюцца па прыгавору суда ў месцах пазбаўлення волі. Любое прамое або ўскоснае абмежаванне выбарчых правоў грамадзян у іншых выпадках з'яўляецца недапушчальным і караецца згодна з законам». Таксама прапануем частку 2 артыкула 4 Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь выкласці ў наступнай рэдакцыі: «У выбарах не ўдзельнічаюць грамадзяне, прызнаныя судом недзеяздольнымі, асобы, якія ўтрымліваюцца па прыгавору суда ў месцах пазбаўлення волі».

**Літаратура**

1 Конституция Республики Беларусь: с изм. и доп., принятыми на респ. референдумах 24 ноября 1996 г. и 17 октября 2004 г. – Минск: Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь, 2016. – 64 с.

2 Конституция Российской Федерации (принята всенародным голосованием 12.12.1993) (с учетом поправок, внесенных Законами РФ о поправках к Конституции РФ от 30.12.2008 N 6-ФКЗ, от 30.12.2008 N 7-ФКЗ, от 05.02.2014 N 2-ФКЗ, от 21.07.2014 N 11-ФКЗ) // Собрание законодательства РФ. – 2014. – N 31. – 4398 с.

3 О выборах в Республике Казахстан [Электронный ресурс]: Конситуционный закон Республики Казахстан от 28 сентября 1995 года № 2464. – Режим доступа: //online.zakon.kz/. – Дата доступа: 08.04.2019.

4 Конституция Литовской Республики: принята гражданами Литовской Республики путем референдума 25 октября 1992 года [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://worldconstitutions.ru/?p=115. – Дата доступа: 08.04.2019.

**УДК 346.93(476):346.93(470):346.93(477)**

***А. А. Кушнярова***

## АРБІТРАЖНЫ РАЗБОР У РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ, РАСІЙСКАЙ ФЕДЭРАЦЫІ І УКРАІНЕ: ПАРАЎНАЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА

*Артыкул прысвечаны пытанню прымянення пры вырашэнні спрэчкі ў арбітражным судзе «права справядлівасці» (ex aequo et bono) або прыняцця арбітражнага рашэння ў парадку «сяброўскага пасярэдніка» (amiable compositeur). Разгледжана заканадаўства Расійскай Федэрацыі, Рэспублікі Беларусь і Украіны, а таксама міжнародныя дагаворы, такія як Еўрапейская канвенцыя аб знешнегандлёвым арбітражы, Тыпавы закон ЮНСІТРАЛ «Аб міжнародным гандлёвым арбітражы».*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Арбітраж існаваў на працягу многіх стагоддзяў. Пра гэта сведчаць працы старажытных грэкаў і рымлян. Так, Арыстоцель пісаў, што арбітр імкнецца да справядлівасці, суддзя – да закону; арбітраж створаны, каб справядлівасць магла быць рэалізаваная.

Прадстаўнікі розных прававых сем'яў глядзелі на арбітраж як на просты метад вырашэння спрэчак абраным імі арбітрам, чый аўтарытэт з'яўляецца адзінай прычынай выбару яго ў якасці арбітра. У краінах кантынентальнай прававой сям'і адносіліся да арбітражу як да «вельмі прымітыўнай формы правасуддзя». Нескладана патлумачыць «прымітыўную» прыроду арбітражу, якая гістарычна фарміравалася: два гандляры пры ўзнікненні спрэчкі паміж імі для яе вырашэння звярталіся да трэцяга, якому яны давяралі. Яны выкарыстоўвалі такі метад вырашэння спрэчак, як арбітраж не таму, што гэта было прадугледжана законам, а таму, што так было прынята ў дзелавым абароце [1, с. 271].

У пункце 2 артыкула VII Еўрапейскай канвенцыі аб знешнегандлёвым арбітражы замацавана, што арбітры выносяць рашэнне ў якасці «сяброўскіх пасярэднікаў, калі паміж бакамі на гэты конт ёсць дамоўленасць і калі прымянімы закон гэта дазваляе [2]. Такім чынам, замест таго, каб разглядаць спрэчку на падставе норм права, арбітражны суд можа разгледзець яго на падставе «маральных прынцыпаў».

Аналагічны падыход змяшчаецца ў пункце 3 артыкула 28 Тыпавога закону ЮНСІТРАЛ «Аб міжнародным гандлёвым арбітражы», згодна з якім арбітражны суд можа прымаць рашэнне ex aequo et bono (па справядлівасці) ці як «сяброўскі пасярэднік» толькі ў тым выпадку, калі бакі прама ўпаўнаважылі яго на гэта [3].

Аднак з разглядаемых трох краін (Рэспублікі Беларусь, Расійскай Федэрацыі і Украіны) толькі ўкраінскі заканадавец вырашыў запазычыць дадзеную норму шляхам замацавання яе ў пункце 3 артыкула 28 Закона Украіны аб міжнародным камерцыйным арбітражы [4].

Сутнасць рашэння ex aequo et bono (па справядлівасці) заключаецца ў тым, што бакі адпаведных адносін могуць прадугледзець, прычым як папярэдне, так і пасля, што ў выпадку ўзнікнення паміж імі спрэчкі адпаведная спрэчка будзе разглядацца не на падставе якіх-небудзь канкрэтных нормаў права, і нават без прымянення нормаў права як такіх, а грунтуючыся на агульных прынцыпах, і перш за ўсё на прынцыпах добрасумленнасці і разумнасці.

Іншымі словамі, у выпадку, калі бакі вырашылі скарыстаць дадзенае палажэнне, гэта фактычна азначае, што яны палічылі больш правільным і справядлівым прымяненне да сваіх спрэчных адносін не міжнародных публічных дагавораў, нацыянальнага заканадаўства і г. д., а прымяненне агульнамаральных прынцыпаў.

Такім чынам, склад арбітражу не разглядае спрэчку на падставе нормаў права, а спрабуе яе вырашыць зыходзячы з прынцыпаў справядлівасці, разумнасці, добрасумленнасці, але пры гэтым з улікам інтарэсаў абодвух бакоў спрэчкі.

Дзейнічаючы як «сяброўскі пасярэднік», склад арбітражу спрабуе ўрэгуляваць адносіны бакоў, каб у максімальнай ступені задаволіць запыты абодвух бакоў і пры гэтым у мінімальнай ступені парушыць яе маёмасныя інтарэсы.

Азначанае палажэнне знаходзіць сваё пацверджанне і ў многіх арбітражных рэгламентах.

Найбольшая колькасць прыхільнікаў вучэння аб магчымасці вырашэння спрэчкі па праве справядлівасці (ex aequo et bono) або прыняцця арбітражнага рашэння ў парадку «сяброўскага пасярэдніка» (amiable compositeur) мае месца ў Германіі. Яго асноўныя палажэнні і сёння падтрымліваюцца некаторымі навукоўцамі. Напрыклад, А. В. Ціхоцкі падкрэслівае, што трацейскі разбор – гэта не судаводства, а пасярэдніцтва, заснаванае на грамадзянска-прававым дагаворы аб усталяванні правоў [5, с. 66].



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

На падставе пункта 5 артыкула 38 Рэгламенту Міжнароднага арбітражнага суда пры Беларускай гандлёвай прамысловай палаце Рэспублікі Беларусь, вырашэнне спрэчкі па справядлівасці (на падставе агульнапрынятых нормаў маралі) дапускаецца толькі пры наяўнасці прама выяўленай згоды абодвух бакоў, і калі гэта не супярэчыць імператыўным нормам заканадаўства [6]. Аднак адзначанае палажэнне прымянімае толькі пры разглядзе спрэчкі ў Міжнародным арбітражным судзе пры БелГПП і адсутнічае ў нормах, якія рэгламентуюць дзейнасць іншых міжнародных арбітражных (трацейскіх) судоў у Рэспубліцы Беларусь.

У сувязі з выкладзеным, дадзенае палажэнне неабходна прадугледзець у заканадаўстве Рэспублікі Беларусь шляхам дадання артыкула 36 Закона Рэспублікі Беларусь аб Міжнародным арбітражным (трацейскім) судзе ад 1999/07/09 г. № 279-З часткай 4 наступнай рэдакцыі:

«4. Міжнародны арбітражны суд мае права на вырашэнне спрэчкі па справядлівасці (на падставе агульнапрынятых нормаў маралі) пры наяўнасці прама выяўленай згоды абодвух бакоў і калі гэта не супярэчыць імператыўным нормам заканадаўства».

Магчымасць прымянення дадзенага палажэння дазволіць бакам у выпадку ўзнікнення паміж імі спрэчкі разглядаць яе не толькі на падставе якіх-небудзь канкрэтных нормаў права, але і пры выказванні іх волі нават без прымянення нормаў права саміх па сябе, а грунтуючыся на агульных прынцыпах, і перш за ўсё на прынцыпах добрасумленнасці і разумнасці.

**Літаратура**

1 Каса, И. Арбитраж (третейский суд): история создания и правовая природа / И. Каса // Вестник РУДН. Юридические науки. – № 2. – 2018. – С. 269–288

2 О внешнеторговом арбитраже [Электронный ресурс]: Европейская конвенция, 21 апрел. 1961 г. // Консультант Плюс: Беларусь. Технология 3000 / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2019.

3 О международном торговом арбитраже [Электронный ресурс]: Типовой закон Комиссии Организации Объединенных Наций по праву международной торговли, 21 июн. 1985 г. // Консультант Плюс: Беларусь. Технология 3000 / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2019.

4 О международном коммерческом арбитраже [Электронный ресурс]: Закон Украины, 24 февр. 1994 г., № 4002-XII // Kodeksy.com.ua. – 2018. – Режим доступа: http://kodeksy.com.ua. – Дата доступа: 11.03.2019.

5 Цихоцкий А. В. Теоретические проблемы эффективности правосудия по гражданским делам: моногр. / А. В. Цихоцкий. – Новосибирск: Наука. Сибирское предприятие РАН, 1997. − 392 с.

6 Регламент Белорусской торгово-промышленной палаты [Электронный ресурс]: утвержден Постановлением Президиума Белорусской торгово-промышленной палаты от 17.03.2011 г.: текст Регламента по состоянию на 20 марта 2018 г. // Консультант Плюс: Беларусь. Технология 3000 / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск: [б. и.], 2019.

7 О международном арбитражном (третейском) суде [Электронный ресурс]: Закон Респ. Беларусь, 9 июля 1999 г., № 279-З // Консультант Плюс: Беларусь. Технология 3000 / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск: [б. и.], 2019.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**UDC 314.7**

***D. A. Mikolaychuk***

# THE MAIN DIRECTIONS OF MIGRATION POLICY IN THE REPUBLIC OF BELARUS

*This article is devoted to the main directions of the migration policy of the Republic of Belarus. Migration policy determines the direction of migration processes and the formation of migration links, taking into account economic, political and demographic features. The article presents the main statistical data on migration in the Republic of Belarus for 2018, and also considers the priority directions of the policy in the field of labor, forced and illegal migration.*

Migration of population is a complex social process that is closely associated with changes in the economic structure and allocation of productive forces, as well as with the growth of social and labor mobility of the population.

The migration policy of the Republic of Belarus is aimed at regulating migration flows in the interests of the socio-economic and demographic development of our country, protecting the national labor market from an uncontrolled influx of foreign labor, encouraging a reduction in emigration outflow of scientific, technical, intellectual and creative potential of the Republic of Belarus, integration of migrants into Belarusian society, overcoming the negative effects of illegal migration.

Migration policies are closely interrelated with demographic security. So, according to Article 5 of the Law of the Republic of Belarus «On demographic security of the Republic of Belarus», the main tasks of ensuring demographic security in the field of migration are:

1. Optimization of external and internal migration flows of population;
2. Countering illegal migration;
3. Promoting the voluntary return of Belarusians to their ethnic homeland (by place of birth) [1].

Labor and forced migration have a significant impact on the migration processes taking place in the Republic of Belarus.

The migration policy of the Republic of Belarus in the field of external labor migration is aimed at improving the regulation of export and import of labor, protecting the national labor market from an uncontrolled influx of foreign labor and alleviating the situation on the internal labor market by employing Belarusian citizens abroad.

The Republic of Belarus still remains attractive for labor migrants, despite a slight decrease in the number of foreigners arriving to work in the country. The decrease in the total number of foreign citizens is due, primarily, to a decrease in the flow of labor migrants arriving in the country from Ukraine.

In 2018, the internal affairs agencies of the Republic of Belarus issued (extended) 12,439 special permits for the right to engage in labor activities in the Republic of Belarus, including in Minsk 5 972, Brest region – 946, Vitebsk – 431, Gomel – 691, Grodno – 1 968, Minsk – 2 143, Mogilev – 283 [2].

A significant number of foreigners who entered Belarus to work were citizens of Ukraine (4,060), China (2,789), Uzbekistan (1,223). The overwhelming majority of immigrant workers arrived in workers' occupations (4,033).

Among the problems of migration policy in the Republic of Belarus, a lot of attention is drawn to the issues of labor migration management within the framework of the Eurasian Economic Union. Being an integral and organic part of the economy, external migration processes require regulation by state authorities in the form of specific measures, primarily in the area of normative legal regulation. This requires:

– a certain system of guarantees provided by the employment services of their country ;

– legal support of labor relations;

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ